Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

1 ЛІСТАПАДА 2013 г. ПЯТНІЦА № 207 (27572) Кошт 1800 рублёў

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

## СВЯТА КІНО

***Удзельнікам XX Мінскага міжнароднага кінафестывалю «Лістапад»***

Дарагія сябры! Сардэчна віншую вас з адкрыццём XX Мінскага міжнароднага кінафестывалю «Лістапад».

Зарадзіўшыся як форум краін СНД і Балтыі, за мінулыя дзесяцігоддзі «Лістапад»ператварыўся ў адну з найбуйнейшых еўрапейскіх творчых акцый, фестываль фестываляў, які збірае на беларускай зямлі лепшыя сусветныя прэм'еры. Ён нязменна верны свайму прызначэнню — з дапамогай мастацтва ўмацоўваць згоду і ўзаемаразуменне паміж народамі, садзейнічаць замацаванню ў грамадстве ідэалаў духоўнасці і гуманізму. З года ў год растуць шэрагі ўдзельнікаў фестывалю — гэта наглядная пацвярджэнне таму, што высакароднае імкненне знаходзіць водгук у сэрцах паклоннікаў кіно. Сёлетні, юбілейны «Лістапад» — гэта сапраўднае свята, якое прадстаўляе шырокую панараму сучаснага кінематографа, дорыць радасць сустрэч з выдатнымі майстрамі і ўзыходзячымі зоркамі сусветнага экрана.

Няхай жа наш любімы фестываль і надалей захоўвае славутыя традыцыі і ў той жа час застаецца адкрытым для яркіх эксперыментаў і наватарскіх ідэй, уносячы важкі ўклад у пашырэнне міжнароднага культурнага супрацоўніцтва.

Зычу вам добрага здароўя, невычэрпных творчых сіл, незабыўных праглядаў, цікавых дыскусій, шчасця і цудоўнага настрою.

**Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь Аляксандр ЛУКАШЭНКА.**

# СЯБРОЎСКІЯ КРАІНЫ ЗАЎСЁДЫ БУДУЦЬ ПОБАЧ

**Учора ў Мінску адбыліся перагаворы Аляксандра Лукашэнкі і Прэзідэнта Эквадора Рафаэля Карэа Дэльгада, які прыбыў у Беларусь з афіцыйным візітам. Сустрэчы лідараў дзвюх краін адбыліся ў вузкім і пашыраным складах.**



Фота БЕЛТА.

«Беларусь надае вялікае значэнне пашырэнню адносінаў з Эквадорам ва ўсіх сферах і гатовая на дзяржаўным узроўні прымаць усе неабходныя крокі для таго, каб наша супрацоўніцтва ў самыя кароткія тэрміны магло выйсці на высокі ўзровень», — сказаў Аляксандр Лукашэнка, вітаючы высокага госця. «У гэтым складаным неспакойным свеце, з фінансава-эканамічным крызісам, які пакуль працягваецца, са знешнімі пагрозамі і палітычнымі інтрыгамі, як ніколі важна, каб побач былі сяброўскія краіны, якія дапамогуць у цяжкую хвіліну», — падкрэсліў Прэзідэнт Беларусі.

Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што адносіны паміж Беларуссю і Эквадорам будуюцца на прынцыпах узаемапавагі і ўзаемаразумення, суверэнітэту і неўмяшання ва ўнутраныя справы. Прэзідэнт Беларусі звярнуў увагу на станоўчыя прыклады супрацоўніцтва Беларусі і Эквадора. Паводле яго слоў, гэта ўзаемадзеянне ў нафтавай сферы, маюцца намеры рэалізоўваць сумесныя праекты ў галіне прамысловасці, сельскай гаспадаркі. Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што ўжо 1 лістапада ў Мінску пройдзе першае пасяджэнне сумеснай камісіі па навукова-тэхнічным супрацоўніцтве, падчас якога бакі вызначаць перспектыўныя напрамкі работы ў гэтай важнай сферы.

«Мы з вялікай сімпатыяй і ўвагай сочым за тымі пераўтварэннямі, што ідуць у Эквадоры, за ростам аўтарытэту краіны ў лацінаамерыканскім рэгіёне і на міжнароднай арэне ў цэлым, — сказаў беларускі лідар. — Беларусь высока ацэньвае незалежны курс, а таксама прынцыповую пазіцыю, якую Эквадор займае ў ААН, руху недалучэння і іншых міжнародных арганізацыях, актыўна і рашуча выступаючы за пабудову шматпалярнага свету і наладжванне ўзаемавыгаднага і раўнапраўнага супрацоўніцтва з усімі дзяржавамі».

Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што кіраўнікі дзвюх дзяржаў намецілі асноўныя шляхі актывізацыі двухбаковага супрацоўніцтва, абмяняліся думкамі адносна ключавых кірункаў палітычнага і гандлёва-эканамічнага ўзаемадзеяння, вызначылі арыенціры на перспектыву. Кіраўнік беларускай дзяржавы падкрэсліў, што яму проста весці дыялог з Рафаэлем Карэа Дэльгада.

Аляксандр Лукашэнка запэўніў, што ўсе дамоўленасці, якія былі дасягнуты падчас яго візіту ў Кітай і перамоў у Мінску, будуць свята выконвацца. «Мы зробім усё, каб вы ніколі не пашкадавалі, што прыехалі ў Беларусь. Мы хочам, каб вы ведалі, што за тысячу кіламетраў ад вас ёсць людзі, якія ведаюць пра Эквадор, і каб вашы людзі былі задаволеныя нашым супрацоўніцтвам. Вы заўсёды жаданыя госці на беларускай зямлі», — падкрэсліў беларускі лідар. Ён выказаў упэўненасць, што ў беларуска-эквадорскіх адносін выдатныя перспектывы, а супрацоўніцтва будзе плённым і ўзаемавыгадным.

Паводле слоў Рафаэля Карэа Дэльгада, Эквадор мае намер поўнасцю скарыстацца патэнцыялам і магчымасцямі супрацоўніцтва з Беларуссю. «Вашы дасягненні ў навуцы, тэхналогіях, адукацыі ўяўляюць вялікую цікавасць для Эквадора. Мы не ўпусцім магчымасці скарыстацца вашым патэнцыялам. У нас велізарнае поле для сумеснай дзейнасці», — сказаў Рафаэль Карэа Дэльгада. Ён адзначыў, што яго візіт у Беларусь стаў вельмі плённым. «Падчас сённяшніх перамоў мы вызначылі 4-5 выгадных сфер, у якіх супрацоўніцтва будзе развівацца хутка. І ўсяго каля 15 напрамкаў, якія павінны быць даследаваны», — сказаў Прэзідэнт Эквадора. Паводле яго слоў, ужо зараз ёсць рэальныя вынікі супрацоўніцтва паміж дзвюма краінамі, напрыклад, у галіне нафтавых радовішчаў і ўзаемадзеяння ў гэтай сферы прадпрыемстваў «Беларуснафта» і «Петраамазонас».

«Маецца велізарны патэнцыял супрацоўніцтва ў плане паставак і стварэння ў Эквадоры вытворчасці трактароў па беларускіх тэхналогіях, вытворчасці медыкаментаў. Вялікая цікавасць ёсць да супрацоўніцтва ў энергетычнай сферы, — адзначыў Рафаэль Карэа. — У гэтых сектарах наша супрацоўніцтва адназначна выходзіць за межы простага гандлю. Мы робім наступны крок у галіне перадачы тэхналогій і арганізацыі сумеснай вытворчасці. Дзякуючы супрацоўніцтву з Беларуссю з'яўляецца надзея, што мы самі зможам выпрацоўваць прадукцыю з высокім дабаўленым коштам. Гэта з'яўляецца часткай нашай рэвалюцыі ў тэхналагічным і вытворчым вымярэнні».

Акрамя таго, па словах Рафаэля Карэа, Эквадор зацікаўлены ў стварэнні на сваёй тэрыторыі вытворчасцяў высокатэхналагічных тавараў. «У нас дастаткова шмат прыродных рэсурсаў. Нам не хапае чалавечага капіталу і тэхналогій», — дадаў Прэзідэнт Эквадора.

Для больш цеснага і зладжанага супрацоўніцтва дзве краіны маюць намер стварыць сумесную міжурадавую камісію па пытаннях гандлёва-эканамічнага супрацоўніцтва. Прэзідэнт Эквадора паведаміў, што праз некалькі тыдняў Беларусь наведае афіцыйная дэлегацыя Эквадора на чале з віцэ-прэзідэнтам. У час візіту плануецца дэталёва разгледзець усе патэнцыйныя магчымасці развіцця двухбаковага супрацоўніцтва.

**Паводле паведамленняў прэс-службы Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь і БЕЛТА.**



# ЧАРАЎНІК, ЯКІ АЖЫЎЛЯЕ КАМЕНЬ

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

**Член Саюза мастакоў Беларусі, жыхар Светлагорска Аляксандр Камардзін каля дзесяці гадоў займаецца апрацоўкай каменю. Нядаўна ён скончыў працу над лірычнай кампазіцыяй з граніту «Закаханы конік» (на фотаздымку), якая прызначана для ўпрыгожвання паркавай прасторы.**

— Я працаваў над гэтай выявай тры месяцы, — кажа скульптар. — Уяўляю, што асабліва дзецям будзе ў радасць дакранацца да коніка, коўзацца на ім, фатаграфавацца.

Цяпер майстар працуе над чарговай каменнай кампазіцыяй, навеянай яму міфалагічным сюжэтам «Леда і Лебедзь». А творчай майстэрняй Аляксандру Камардзіну служыць невялікая пляцоўка на тэрыторыі колішняга завода жалезабетонных вырабаў у гарадскім пасёлку Парычы.

# ТЭНДЭНЦЫЯ СТАНОЎЧАЯ, АЛЕ НЕ ЗДАВАЛЬНЯЮЧАЯ

## Урад адказаў на пытанні парламентарыяў на сумесным пасяджэнні дзвюх палат Нацыянальнага сходу

**Першы віцэ-прэм'ер Уладзімір СЯМАШКА, выступаючы перад парламентам з аналізам працэсаў прамысловай і энергетычнай мадэрнізацыі, паведаміў, што тэмп росту прамысловай вытворчасці Беларусі за 9 месяцаў гэтага года склаў 95,4% да аналагічнага перыяду мінулага года. Да канца года гэты паказчык можа вырасці да 98%. Пры заданні на гэты год 107% тэмп, што прагназуецца, нельга назваць здавальняючым вынікам, сказаў віцэ-прэм'ер, аднак ёсць і станоўчая тэндэнцыя.**

**Складскія запасы павінны знізіцца да канца года да 60-62%. У прамысловасці і энергетыцы ўдалося знізіць працэнт зношанасці асноўных сродкаў да 45 пунктаў, што з'яўляецца паказчыкам стабільнай работы галіны.**

### Неабходнасць адзіных правіл

Сярод прычын эканамічнага спаду віцэ-прэм'ер на першым месцы назваў суб'ектыўны фактар. Умовы аднолькавыя, а вынікі розныя, заўважыў ён. Безумоўна, негатыўна на развіцці прамысловасці адбіваюцца шматлікія выключэнні і абмежаванні ў Мытным саюзе і Адзінай эканамічнай прасторы. Уладзімір Сямашка прывёў у якасці прыкладу пастанову расійскага ўрада ад 27 снежня 2012 года, якая фактычна закрыла паступленне беларускай сельскагаспадарчай тэхнікі на расійскі рынак.

Віцэ-прэм'ер звярнуў увагу на сітуацыю, якая сёння складваецца ў Расійскай Федэрацыі і ў цэлым у Мытным саюзе па ўтылізацыйным зборы. «Нядаўна прыняты закон Расійскай Федэрацыі аб тым, што ўтылізацыйны збор будзе збірацца па краіне прызначэння. Для Беларусі, калі нічога не рабіць, для беларускіх вытворцаў гэта азначае страту канкурэнтаздольнасці», — сказаў ён.

Для мінімізацыі страт беларускіх вытворцаў неабходна ў рамках падрыхтоўкі нарматыўнай базы Адзінай эканамічнай прасторы Беларусі, Казахстана і Расіі вызначыць адзіныя правілы вытворчасці і рэалізацыі прадукцыі, лічыць першы намеснік прэм'ер-міністра. «Стаіць задача вырашыць гэтую праблему да 1 студзеня 2015 года. Але некаторыя пытанні неабходна вырашыць значна раней. Хто б што ні казаў, але рынак Расіі і Мытнага саюза застаецца адным з асноўных нашых рынкаў, і мы павінны мець на ім пэўныя і зразумелыя правілы гульні. Гэта будзе залогам паспяховай работы нашай прамысловасці і ў цэлым народнагаспадарчага комплексу», — сказаў ён.

### Выйсці за постсавецкія межы

Другім негатыўным фактарам для развіцця беларускай прамысловасці віцэ-прэм'ер лічыць высокую ступень прывязанасці да рынку Мытнага саюза і постсавецкай прасторы. Ён лічыць неабходным рэзка актывізаваць працэс уступлення Беларусі ў Сусветную гандлёвую арганізацыю. Акрамя таго, Беларусі неабходна ствараць зоны свабоднага гандлю з іншымі краінамі.

У якасці прыкладу Уладзімір Сямашка прывёў сітуацыю з пастаўкай беларускай прадукцыі ў Інданезію і краіны АСЕАН. У сакавіку гэтага года адбыўся візіт у Інданезію кіраўніка беларускай дзяржавы, вынікам якога стала рэалізацыя праграмы па нарошчванні экспарту ў гэтую краіну і ў цэлым у рэгіён. «Але гэта няпростая задача. Калі палічыш усе мытныя пошліны і іншыя паборы пры пастаўках нашай прадукцыі, то налічваеш ад 45 да 53 працэнтаў увазной пошліны, гэта значыць, што адразу пры ўвозе тэхніка падаражэе амаль у паўтара раза», — адзначыў віцэ-прэм'ер.

СТАР. 2



Фота БЕЛТА.

*ЛІЧБА ДНЯ*

***Br7 млн —***

***да гэтай лічбы набліжаецца сярэдні заробак у Мінску, паведамляе галоўнае статыстычнае ўпраўленне сталіцы. Так, у верасні намінальная налічаная сярэдняя заработная плата работнікаў склала Br6910,4 тыс. Што датычыцца сярэднямесячнай зарплаты, то ў студзені—верасні сёлета яна была роўная Br6440,8 тысячы і павялічылася ў параўнанні са студзенем—вераснем 2012 года ў 1,4 раза. Найбольш высокааплатнымі ў сталіцы ў студзені—верасні гэтага года былі работнікі арганізацый, звязаных з вылічальнай тэхнікай і фінансавай дзейнасцю. Сярэднямесячная заработная плата работнікаў у гэтых арганізацыях склала, адпаведна, Br12899,7 тыс. і Br10150,9 тыс. Стабільна высокай застаецца аплата працы работнікаў будаўніцтва.***

НАДВОР'Е СЁННЯ

| | |
|---|---|
| Брэст | + 12° |
| Віцебск | + 9° |
| Гомель | + 10° |
| Гродна | + 8° |
| Магілёў | + 9° |
| Мінск | + 10° |

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 01.11.2013 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 9230,00 | ▲ |
| Еўра | 12650,00 | ▼ |
| Рас. руб. | 288,00 | ▲ |
| Укр. грыўня | 1127,60 | ▲ |

■ Надвор'е

### Усё яшчэ цёпла...

Максімальная тэмпература паветра ў першы дзень лістапада будзе дасягаць 7-13 градусаў, паведаміла рэдакцыі **спецыяліст Рэспубліканскага гідраметцэнтра Мінпрыроды Вольга ФЯДОТАВА**. А вось у суботу да нас завітаюць няўстойлівыя паветраныя масы з боку Заходняй Еўропы. Таму ўначы ў асобных раёнах, а ўдзень у паўночна-заходнім рэгіёне чакаюцца непрацяглыя дажджы.Тэмпература паветра ўначы на суботу плюс 2-8 градусаў, удзень — ад 7 да 13 цяпла, а ў Брэсцкай і Гомельскай абласцях месцамі да 15 градусаў. Канчаткова сапсуецца надвор'е ў нядзелю. Пад уплывам атмасферных франтоў на большай частцы краіны будуць ісці кароткачасовыя дажджы. На поўначы Беларусі месцамі ўзмацненне ветру да 15-18 м/с. Уначы на нядзелю тэмпературны фон складзе ад 5 да 11 градусаў, удзень — 8-13 цяпла, а па поўдні краіны да плюс 15 градусаў.

Паводле доўгатэрміновых прагнозаў айчынных сіноптыкаў, у панядзелак захаваецца няўстойлівае і ўмерана цёплае надвор'е.

**Сяргей КУРКАЧ.**

## ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

### ЗША АДМОВІЛІСЯ ГАРАНТАВАЦЬ ГЕРМАНІІ АБАРОНУ АД ШПІЯНАЖУ

Вашынгтон адмовіўся даць Германіі якія-небудзь гарантыі абароны ад шпіянажу з боку амерыканскіх спецслужбаў. Пра гэта паведамляе газета Frankfurter Allgemeine Zeitung у сувязі з безвыніковымі перамовамі прадстаўнікоў дзвюх краін у Белым доме, якія адбыліся 30 кастрычніка. Антышпіёнскае пагадненне, прыняцця якога дамагаецца Берлін, пакуль так і не было ўхвалена Злучанымі Штатамі. Дакумент, на прыняцці якога настойвае Берлін, прадугледжвае забарону на сачэнне за ўрадамі, дзяржаўнымі органамі і дыпламатамі краін — удзельніц дагавора. Акрамя таго, Германія патрабуе гарантаваць абарону персанальных звестак і прыватнага жыцця нямецкіх грамадзян, за якімі, мяркуючы па дакументах, што трапілі ў СМІ, ЗША таксама сачылі.

### ЛЕПСА ПРЫЛІЧЫЛІ ДА «ПОСТСАВЕЦКАЙ МАФІІ»



Амерыканскія ўлады ўсведамлялі, што высоўваюць абвінавачванні ў прыналежнасці да так званага Еўразійскага злачыннага сіндыката «Брацкае кола» менавіта супраць вядомага расійскага эстраднага выканаўца Георгія Лепса. На іх думку, ён «служыць кур'ерам для дастаўкі грошай ад імя Лявонцьева», аднаго з кіраўнікоў сіндыката. Гэта пацвердзіў афіцыйны прадстаўнік міністэрства фінансаў ЗША Джон Саліван. «Так, ён спявак. Мы ўключылі яго ў гэты спіс за працу на Уладзіслава Лявонцьева, які стаў фігурантам спіса ў лютым 2012-га», — заявіў Саліван.

### УЛАДЗІМІР ПУЦІН ПРЫЗНАНЫ САМЫМ УПЛЫВОВЫМ ЧАЛАВЕКАМ У СВЕЦЕ ПА ВЕРСІІ FORBES

Прэзідэнт Расіі Уладзімір Пуцін стаў самым уплывовым чалавекам у свеце па версіі часопіса Forbes. Ён абышоў лідара ЗША Барака Абаму, які да гэтага займаў першыя пазіцыі шмат разоў. Такім чынам, тройка людзей, «якія кіруюць светам», выглядае так: першае месца ў Пуціна, другое — у Абамы, а трэцяе дасталося старшыні КНР Сі Цзіньпіну. Уплыў Пуціна, як гаворыцца ў тлумачальнай запісцы Forbes, павялічыўся дзякуючы «шахматнай партыі» вакол Сірыі, а Абама страціў частку сваёй магутнасці з-за скандалу са спецслужбамі ЗША.

ISSN 1990 - 763X

ПАДРАБЯЗНАСЦІ

### ЦЫТРУСАВЫЯ ШКОДЗЯЦЬ ЗДАРОЎЮ ЖАНЧЫН?



На працягу 22 гадоў брытанскія дыетолагі вывучалі папулярныя дыеты. Іх высновa такая: фруктовыя дыеты вельмі небяспечныя для жанчын, перадае Independent-news.ru. У прыватнасці, медыкі перасцерагаюць ад цытрусавых, асабліва папулярных ва ўсім свеце. Сюды адносяцца апельсіны, лімоны, якія могуць выклікаць сур'ёзныя праблемы са здароўем. Напрыклад, актыўнае спажыванне цытрусавых павышае рызыку запалення касцявой тканкі на 41%. Прычым гэта тычыцца толькі жаночага полу, пра што відавочна сведчыла абследаванне 78000 жанчын. Спецыялісты таксама адзначаюць: шкодная не толькі садавіна, але апельсінавы і лімонны сокі. Іх не варта спажываць жанчынам з павышанай кіслотнасцю страўніка, атлусценнем і дыябетам.

А вось даследчыкі з Гарвардскай медыцынскай школы і Жаночага шпіталя Брыгама выявілі ў грэйпфрутах, апельсінах і іншых цытрусавых злучэнне, якое зніжае рызыку інсульту ў жанчын.

Аднак эксперты не раяць злоўжываць цытрусавымі. У гэтых прадуктаў могуць быць пабочныя эфекты. Напрыклад, сок грэйпфрута павышае верагоднасць развіцця праблем з печанню і ўплывае на канцэнтрацыю шэрагу прэпаратаў, якія кантралююць крывяны ціск.






# ТЭНДЭНЦЫЯ СТАНОЎЧАЯ, АЛЕ НЕ ЗДАВАЛЬНЯЮЧАЯ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Міністэрства замежных спраў Беларусі з калегамі па Мытным саюзе праводзіць перамовы аб устанаўленні рэжыму свабоднага гандлю з такімі краінамі, як В'етнам, Новая Зеландыя, дзяржавамі Еўрапейскай асацыяцыі свабоднага гандлю (Нарвегія, Ісландыя, Швейцарыя і Ліхтэнштэйн). Заявілі аб сваім інтарэсе Індыя, Ізраіль, іншыя краіны і эканамічныя блокі. Кыргызстан, Арменія і Украіна выказваліся аб рашэнні паглыбіць адносіны з Мытным саюзам і далучыцца да яго. «Нашым знешнеэканамічным ведамствам неабходна інтэнсіфікаваць гэтыя працэсы», — падкрэсліў Уладзімір Сямашка.

**Зніжэнне энергаёмістасці ВУП дало магчымасць забяспечыць амаль патраенне ВУП рэспублікі практычна без павелічэння спажывання першасных энерганосьбітаў, якія ў сваёй большасці купляюцца за валюту за мяжой.**

## Тэхнічны рэгламент

Стварэнне зон свабоднага гандлю таксама зойме час, таму трэба выкарыстоўваць ужо апрабаваныя спосабы падтрымкі экспарту, дадаў віцэ-прэм'ер. Ён назваў шэраг распрацаваных урадам схем, накіраваных на падтрымку канкурэнтаздольнасці беларускіх тавараў за мяжой. Гэта, напрыклад, аплата з бюджэту паловы альбо поўнай стаўкі па крэдыце пры наяўнасці экспартных кантрактаў.

Не менш важным для развіцця прамысловасці з'яўляецца і ўвага да ўнутранага рынку краіны. «З уступленнем з 1 студзеня 2013 года Расіі ў СГА статыстыка адзначае паступленне на ўнутрырэспубліканскі рынак спажывецкай прамысловай прадукцыі сумніўнай якасці, — паведаміў Уладзімір Сямашка. — З уступленнем Казахстана ў СГА сітуацыя, відавочна, будзе яшчэ больш абвастрацца. Тут прымальны толькі адзін цывілізаваны захад абароны ўласнага рынку — увядзенне ў дзеянне, а калі трэба, то і ўзмацненне жорсткасці ўжо ўведзеных тэхнічных рэгламентаў Мытнага саюза, і жорсткае адсочванне з боку кантрольных органаў іх выканання».

Віцэ-прэм'ер паведаміў, што «з гэтай мэтай Дзяржстандартам Беларусі падрыхтаваны праект указа аб арганізацыі кантрольнай дзейнасці, паўнамоцтвах кантрольных органаў і ўдасканаленні ўсёй сістэмы захадаў». Уладзімір Сямашка выказаў думку, што ўказ да канца 2013 года будзе падпісаны.

Яшчэ адна важная ўмова поспеху — перманентнае інавацыйнае развіццё краіны. «Тыя, хто паспеў перааснасціцца, адчуваюць сябе камфортна», — сказаў першы намеснік прэм'ер-міністра. Ён прывёў прыклад з сітуацыяй на прадпрыемстве «Івацэвічыдрэў», дзе на новым заводзе выпрабляецца прадукцыі ў аб'ёме 224 тысячы долараў на аднаго працоўнага і ўдвая (да 700 долараў у эквіваленце) выраслі заробкі.

## Энергетыка

Уладзімір Сямашка заўважыў, што шматлікія нараканні на адрас энергетычнай сістэмы краіны часта бываюць беспадстаўнымі. Энергаёмістасць ВУП Беларусі знізілася з 690 кг нафтавага эквіваленту на $1 тыс. прадукцыі ў 1990 годзе да 240 кг у 2011-м. За гэты ж перыяд Украіна, для параўнання, скараціла энергаёмістасць ВУП толькі на 40 працэнтаў — да 430 кг, Расія — на 34 працэнты — да 350 кг. «Наш паказчык супастаўны з аналагічным у Фінляндыі і Канадзе — краінах з падобнымі прыродна-кліматычнымі ўмовамі», — канстатаваў Уладзімір Сямашка.

Зніжэнне энергаёмістасці ВУП дало магчымасць забяспечыць амаль патраенне ВУП рэспублікі практычна без павелічэння спажывання першасных энерганосьбітаў, якія ў сваёй большасці купляюцца за валюту за мяжой. Гэта і ёсць галоўны вынік работы па энергазберажэнні, станоўчыя тэндэнцыі трэба захаваць і на перспектыву, рэзюмаваў першы віцэ-прэм'ер.

Ужо трэці год тарыфы на энерганосьбіты для рэальнага сектара эканомікі не павышаюцца, у той час як у Расіі яны ўсе апошнія гады павышаліся на 15 працэнтаў за год. Як вынік, разрыў у тарыфах для спажыўцоў Беларусі і Расіі істотна скараціўся.

«Распрацаваная ўрадам сістэма захадаў, калі яна будзе падтрымана, дае магчымасць спадзявацца, што мы не толькі захаваем тарыфы на 2014 год, але і пры пэўных умовах ад 0,5 цэнта да 1,5 цэнта на 1 кВт/г знізім гэтыя тарыфы для рэальнага сектара эканомікі. На 0,5 цэнта — гарантавана, — адзначыў Уладзімір Сямашка. — Магчыма, знізім цэны на прыродны газ для рэальнага сектара эканомікі. Акрамя таго, напрыклад, «Гродна Азот», цэментныя заводы, Мінэнерга будуць мець эксклюзіўную цану на прыродны газ», — дадаў Уладзімір Сямашка.

Віцэ-прэм'ер запэўніў парламентарыяў, што з уводам Беларускай АЭС сумарнай магутнасцю 2340 МВт Беларусь радыкальна паправіць паліўны баланс краіны. Ён канстатаваў, што сёння склалася вельмі небяспечная залежнасць ад прыроднага газу, які імпартуецца з Расіі. «Амаль 95 працэнтаў нашай генерацыі працуе на газе. З уводам АЭС доля прыроднага газу знізіцца да 66-67 працэнтаў», — сказаў Уладзімір Сямашка. Першы энергаблок магутнасцю 1170 МВт павінен быць уведзены ў эксплуатацыю ў 2018 годзе, другі энергаблок такой жа магутнасці — у 2019-м.

**«Нам трэба перагледзець прынцып кіравання прамысловасцю, перайсці ад галіновага да функцыянальнага.**

## Новае міністэрства

Адказваючы на пытанне дэпутата Вольгі Паліцікі, Уладзімір Сямашка пацвердзіў, што Міністэрства прамысловасці Беларусі плануецца да канца 2014 года пераўтварыць у Міністэрства прамысловай палітыкі. Да канца бягучага года міністр прамысловасці павінен прадставіць сваё бачанне колькасці, структуры, функцый новага міністэрства, якое пачне функцыянаваць з 2015 года.

Першы віцэ-прэм'ер перакананы ў неабходнасці пераўтварэння цяперашняга Мінпрама і падзяліўся сваім бачаннем, як можна зняць праблемныя моманты: «Нам трэба перагледзець прынцып кіравання прамысловасцю, перайсці ад галіновага да функцыянальнага. Таму што ўсё больш прадпрыемстваў становяцца прыватнымі, ствараюцца сумесныя прадпрыемствы і трэба думаць, каб стварыць адзіныя ўмовы работы і для прыватных прадпрыемстваў, і для акцыянерных таварыстваў, дзе дзяржава мае пакет, і для дзяржаўных прадпрыемстваў. Гэта не толькі Мінпрама датычыцца, але і «Беллегпрама», «Беллеспаперапрама», «Белнафтахіма», «Белдзяржхарчпрама».

Парламентарыі задалі каля 100 пытанняў членам урада Беларусі самай рознай тэматыкі. Многія адказы змяшчалі прапанову сумеснага вывучэння праблемы і пошуку яе рашэння.

**Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА.**

■ Знітаванне

# ІМЯ, ЯКОЕ ЯДНАЕ,

## або Як казахі набылі выдатнага цюрколага, а беларусы страцілі вялікага раманіста

**Казахі лічаць, што рука Бога была ў тым, каб пасля ўдзелу ў паўстанні 1830—1831 гадоў беларус Адольф Янушкевіч быў сасланы ў Сібір. Там ён пачаў працаваць у памежным упраўленні, стаў часта сустракацца з казахамі і наведваць розныя куточкі. Янушкевічу глыбока ў сэрца запаў гэты народ і яго зямля. Усё, што бачыў вакол сябе, ён занатоўваў у дзённік. Так і атрымалася, што сёння працы беларуса лічацца найлепшай крыніцай гісторыі жыцця казахаў XIX стагоддзя. Яны бязмежна ўдзячныя яму і цяпер, у XXI стагоддзі. Казахская дэлегацыя спецыяльна пераадолела 4000 кіламетраў і днямі прыехала ў Беларусь, каб ушанаваць нашага славутага земляка.**

Мерапрыемствы па ўшанаванні Адольфа Янушкевіча пройдуць сёння а 11 гадзіне ў вёсцы Дзягільна Дзяржынскага раёна. На іх будзе прысутнічаць Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол Рэспублікі Казахстан у Беларусі Ергалі Булягенаў, пісьменнік Хакім Амар, бізнесмен Сакен Сейфулін, а таксама беларуская інтэлігенцыя.

Напярэдадні госці, якія прыехалі з Казахстана, завіталі ў Выдавецкі дом «Звязда», дзе разам з дырэктарам — галоўным рэдактарам Алесем Карлюкевічам абмеркавалі беларуска-казахскія культурныя праекты. Прысутнічалі таксама дэпутат Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Уладзіслаў Цыдзік, кіраўнік праекта «Беларускі партал у Казахстане» Міхась Буланаў.

Алесь Карлюкевіч расказаў пра беларуска-казахскія літаратурныя стасункі. Шэраг перакладаў казахскіх паэтаў выходзіў у перыёдыцы. У музеі Якуба Коласа ў апошнія гады ладзілася вечарына, прысвечаная казахскаму паэту Джамбулу. Бо ў 1930-х ужо знакавыя творчыя фігуры — Колас і Джамбул — абменьваліся прывітаннямі.

Казахі станоўча ацанілі актыўную папулярызатарскую дзейнасць беларусаў. А каб неяк замацаваць добрыя стасункі, прапанавалі стварыць сумесны цэнтр імя той асобы, якая яднае два народы. Хакім Амар патлумачыў гэты намер:

— Для нас, казахаў, Адольф Янушкевіч — гэта значная фігура. Мы маем 50-томную «Бібліятэку казахскай этнаграфіі», і асобны, 29-ы, том у ёй займаюць «Дзённікі і лісты з вандроўкі па казахскіх стэпах» Адольфа Янушкевіча... Арабскую гісторыю, напрыклад, лепш за ўсіх ведалі ізраільскія гісторыкі. А казахскую гісторыю — расіяне: для таго, каб заваяваць, падпарадкаваць сабе вялізную тэрыторыю. Лепшыя знаўцы, якія пасля сталі вядомымі цюрколагамі, працавалі на такую ідэю. Так распарадзіўся лёс, што і Адольф Янушкевіч апынуўся ў гэтай сістэме. Мы неяк абмяркоўвалі ў сябе на радзіме і вырашылі, што ў тым была рука Бога, наканаванне звыш. Магчыма, у яго асобе свет страціў вялікага пісьменніка, раманіста. Аднак мы атрымалі найвялікшага цюрколага. Тое, што ён пакінуў — гэта бясцэнная спадчына.

Відавочна, што Янушкевіч быў надзвычай уважлівы да ўсяго, што апісваў, і рабіў гэта з беларускай прастатой, непрадузятасцю і талентам сапраўднага творцы. Пра гэта расказвае Хакім Амар:

— Калі паглядзець на гэтую кнігу, яна геніяльна пабудавана. Як быццам шлях абая (феадала), узыходжанне на вяршыню. У гэтым тэксце, які пасля быў перакладзены і выдадзены, увасоблена практычна ўся казахская гісторыя. Гэта этнаграфічны партрэт народа, і ён вымалёўваецца на кожнай старонцы. Янушкевіч расказвае, напрыклад, пра антрапонімы: казахі маглі называць сваіх дзяцей Капітан, Маёр, Пан. Распавядае пра мянушкі жывёл, пра гаспадарку і нават пра становішча жанчыны ў грамадстве. Закранае літаральна ўсе сферы жыцця. А якой мовай гэта напісана! Які пранікнёны погляд у гэтага чалавека! Ён усё заўважае. Я згадваю словы, якія былі сказаны пра Эйнштэйна: «Хто такі геній? Гэта проста чалавек, які ў пэўным прадмеце бачыць больш, чым іншыя». Так і Адольф Янушкевіч — бачыў больш, чым іншыя. А ссыльных у Сібіры было шмат, каля 1000 чалавек. Дарэчы, цікава, што сярод іх былі тыя, хто працаваў на царскую каланіяльную адміністрацыю, і хто наадварот, уцёк з Сібіры і далучыўся да антыкаланіяльнага руху казахаў.

Напрыканцы Выдавецкаму дому «Звязда» была ўручана кніга казахскай кухні. Бо, як патлумачылі шаноўныя госці, Янушкевіч шмат пісаў пра іх нацыянальную ежу — мяса. Ён адзначаў, што ўсе арыстакраты елі плоў і пілі чай (рысу у той час у стэпе не было). А беднякі елі каніну і пілі кумыс. А цяпер усё наадварот. Ежа беднякоў стала далікатэсам, які не ў кожнага ёсць на стале.

Алесь Карлюкевіч адзначыў, што шмат сумесных праграм у Беларусі і Казахстана ўжо ёсць. А ўдзел абедзвюх краін у Мытным саюзе будзе схіляць да іх развіцця і стварэння новых агульных праектаў, у тым ліку культурных.

**Ніна ШЧАРБАЧЭВІЧ** ■

■ Каб помнілі

# ЯНКУ МАЎРА ЎШАНАВАЛА ПУХАВІЧЧЫНА

**На будынку Турынскай сярэдняй школы адкрыта мемарыяльная дошка ў гонар аўтара «Палескіх рабінзонаў».**

І сёння на Пухавіччыне, асабліва ў старажытнай вёсцы Турын, памятаюць вядомага беларускага дзіцячага пісьменніка Янку Маўра. У свой час ён адпачываў у гэтых прыгожых мясцінах на беразе ракі Свіслач. Тут Маўр напісаў і шэраг мастацкіх твораў. Магчыма, у Турыне класік нацыянальнай літаратуры шукаў сюжэты, мастацкія вобразы, «спісваў» партрэты з беларускай дзятвы. На адкрыцці дошкі выступіў зяць пісьменніка і сын Якуба Коласа — доктар тэхнічных навук Міхась Міцкевіч. Пра сённяшняе гучанне твораў Янкі Маўра гаварылі Міхась Пазнякоў, Алесь Камароўскі, Уладзімір Ліпскі. Ініцыятарам адкрыцця мемарыяльнай дошкі выступіў Пухавіцкі раённы краязнаўчы музей.

**Кастусь ЛАДУЦЬКА.**

# ПЕРАПЛАНІРОЎВАЦЬ ЖЫЛЛЁ БУДЗЕ ПРАСЦЕЙ

**Рашэнне аб неабходнасці перагляду працэдур перапланіроўкі было прынята 30 лістапада на калегіі Адміністрацыі Прэзідэнта Беларусі, якая прайшла з удзелам усіх зацікаўленых бакоў, перадае БЕЛТА.**

Кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта Андрэй Кабякоў звярнуў увагу прысутных на вялікую колькасць скаргаў грамадзян у сувязі з ўскладненнем працэдур узгаднення перапланіроўкі жылых памяшканняў. Ён нагадаў, што ў маі 2013 года Савет Міністраў прыняў пастанову № 384, якой быў канкрэтызаваны пералік работ, што маюць дачыненне да перабудовы і перапланіроўкі. Такія работы патрабуюць распрацоўкі праектнай дакументацыі і атрымання ўзгаднення ў мясцовых выканаўчых органах. Дакумент сабраў разам усе патрабаванні, якія датычацца пытанняў перапланіроўкі, аднак у той жа час выклікаў шэраг праблемных момантаў.

Як адзначыў намеснік кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта Валерый Міцкевіч, замест спрашчэння і павышэння празрыстасці гэтых працэдур мае месца іх ускладненне: пашыраецца кола работ, якія патрабуюць дазволу выканкама і распрацоўкі праектнай дакументацыі.

«Людзі пастаянна скардзяцца, што ўзгадненне перабудовы і перапланіроўкі шматэтапнае і заблытанае. Даходзіць да таго, што ў кожным раёне Мінска можа дзейнічаць свой асаблівы парадак. У выніку для атрымання неабходнага ўзгаднення нават па элементарных работах можна хадзіць па розных інстанцыях ледзь не паўгода!» — сказаў Валерый Міцкевіч.

Ён падкрэсліў, што пераважная большасць праектных арганізацый адмаўляецца брацца за распрацоўку праектнай дакументацыі для дробных кватэрных работ. На яго думку, такая сітуацыя стварае спрыяльную глебу для пасрэднікаў, якія нажываюцца на распрацоўцы праектаў і іх узгадненні, а значыць, і для ўзнікнення карупцыйных праяўленняў.

Андрэй Кабякоў лічыць, што павінна быць створана максімальна простая і зразумелая для грамадзян сістэма.

«Павінны быць стандартныя, выразныя патрабаванні да работ, якія праводзяцца. Не трэба ніякіх узгадненняў, але калі пасля выканання гэтых работ да цябе ўзнікнуць прэтэнзіі, высветліцца, што ты зрабіў перабудову з парушэннем устаноўленых патрабаванняў, — адказваеш на поўную катушку, — адзначыў кіраўнік Адміністрацыі. — Інакш мы ўсіх людзей у чэргі паставім».

«Так, ёсць тыя, хто ўстанаўлівае басейны на апошнім паверсе, але каб змагацца з імі, мы прымушаем 95 працэнтаў добрапрыстойных грамадзян праходзіць гэтыя працэдуры», — дадаў Андрэй Кабякоў.

Ён таксама падкрэсліў, што спрашчэнне працэдур не павінна датычыцца капітальных работ і тых дзеянняў, якія парушаюць бяспеку жыцця грамадзян.

Міністр жыллёва-камунальнай гаспадаркі Андрэй Шорац прызнаў, што праблема існуе і адзначыў гатоўнасць ведамства працаваць над аптымізацыяй працэсаў.

У выніку дыскусіі прысутныя прыйшлі да высновы, што пастанову неабходна дапрацаваць, перагледзець колькасць працэдур і спрасціць парадак іх правядзення. На дапрацоўку пастановы вызначана два месяцы.

НАВІНЫ ПАДЗЕІ ФАКТЫ

## КІРОЎЦЫ ЗМОГУЦЬ ВЫКУПІЦЬ СВАЕ КАНФІСКАВАНЫЯ АЎТО НА РОЎНЫХ УМОВАХ З УСІМІ

**Пра тое, што кіроўца, у якога канфіскавалі аўтамабіль за кіраванне «падшафэ», не будзе мець права на першачарговы выкуп свайго транспартнага сродку, паведаміў начальнік упраўлення арганізацыі работы і кантролю выканання выканаўчых дакументаў Міністэрства юстыцыі Беларусі Аляксандр ІЗВАРЫН.**

— Калі кіроўцу двойчы на працягу года затрымалі нападпітку за рулём, то незалежна ад права ўласнасці транспартны сродак падлягае канфіскацыі і пераходзіць у даход дзяржавы, — падкрэсліў Аляксандр Ізварын.

Ён распавёў, што аўтамабіль арыштуюць адразу ж, як толькі кіроўца будзе затрыманы ў стане алкагольнага ап'янення паўторна. Паўторнасць здзяйснення злачынства лічыцца з 24 кастрычніка — гэта значыць з дня ўступлення ў сілу паправак у некаторыя кодэксы Рэспублікі Беларусь па пытаннях узмацнення мер адказнасці за кіраванне транспартным сродкам у стане ап'янення. З моманту арышту аўтамабіль будзе знаходзіцца на штрафстаянцы да разгляду крымінальнай справы судом, незалежна ад таго, хто з'яўляецца яго ўласнікам: непасрэдна кіроўца альбо іншая асоба.

— Транспартны сродак будзе пераходзіць у даход дзяржавы толькі пасля таго, як прысуд уступіць у законную сілу, — удакладніў Аляксандр Ізварын. — Вызначаць канчатковы кошт кожнай канкрэтнай машыны, збіраць неабходныя дакументы і перадаваць транспартны сродак для рэалізацыі будуць камісіі па рабоце з маёмасцю, які ёсць ва ўсіх райвыканкамах і адміністрацыях раёна. Чалавек, у якога канфіскавалі машыну, зможа ўдзельнічаць у яе выкупе. Аднак права першачарговага выкупу ў такіх грамадзян не будзе — толькі на агульных падставах з усімі.

Паводле слоў Аляксандра Ізварына, канкрэтныя справы могуць паступіць у суды ўжо да канца гэтага года.

**Надзея ДРЫЛА.**

## У ЛІСТАПАДЗЕ ПАВЯЛІЧВАЮЦЦА ТАРЫФЫ НА ГАЗ, ЦЯПЛО І ЭЛЕКТРЫЧНАСЦЬ

**Тарыфы на цеплавую энергію для патрэб ацяплення і гарачага водазабеспячэння, а таксама на прыродны газ і электраэнергію для насельніцтва павышаюцца з 1 лістапада. Гэта прадугледжана Пастановай Савета Міністраў № 941 ад 30 кастрычніка 2013 года, што была апублікавана ўчора на Нацыянальным прававым інтэрнэт-партале Беларусі.**

Згодна з дакументам, тарыф на цеплавую энергію для патрэб ацяплення і гарачага водазабеспячэння павялічаны з 70 898,5 рубля да 75 719,6 рубля за 1 Гкал (на 6,4%).

Кошт аднаго кубаметра газу, што выкарыстоўваецца ў жылых дамах і кватэрах з устаноўленымі прыборамі індывідуальнага ўліку расходу, пры наяўнасці індывідуальных газавых ацяпляльных прыбораў і (або) газавых воданагравальнікаў у ацяпляльны перыяд павялічыўся з 404,3 рубля да 440 рублёў (на 8,1%), у летні перыяд — з 1 232,4 рубля да 1 466,6 рубля (на 16%). Пры адсутнасці індывідуальных газавых ацяпляльных прыбораў — з 1 232,4 рубля да 1 466,6 рубля (на 16%) незалежна ад сезона.

Аплата за газ, які выкарыстоўваецца ў жылых дамах і кватэрах без прыбораў індывідуальнага ўліку расходу, пры наяўнасці газавай пліты і цэнтралізаванага гарачага водазабеспячэння з аднаго жыхара ў месяц вырасла з 9 850 рублёў да 11 750 рублёў (на 19,3 %) за кубаметр. Пры наяўнасці газавай пліты і газавага воданагравальніка (пры адсутнасці цэнтралізаванага гарачага водазабеспячэння ) — з 28 350 рублёў да 33 750 рублёў (на 19%), пры наяўнасці газавай пліты і адсутнасці цэнтралізаванага гарачага водазабеспячэння і газавага воданагравальніка — з 16 000 рублёў да 19 050 рублёў (на 19%).

Электрычная энергія ў жылых дамах (кватэрах), абсталяваных ва ўстаноўленым парадку электрычнымі плітамі, па аднаставачным тарыфе будзе каштаваць 518,9 рубля за кВт/г, пры дыферэнцаваным тарыфе па часавых перыядах: мінімальных нагрузак (з 22.00 да 17.00) — 363,2 рубля за кВт/г, максімальных нагрузак (з 17.00 да 22.00) — 1037,8 рубля за кВт/г.

Электрычнасць для патрэб ацяплення і гарачага водазабеспячэння з далучанай магутнасцю абсталявання больш за 5 кВт у перыяд мінімальных нагрузак (з 23.00 да 6.00) будзе цяпер каштаваць 610,6 рубля за кВт/г, у астатні час сутак — 1831,8 рубля за кВт/г. У іншых выпадках электрычная энергія па аднаставачным тарыфе стане каштаваць насельніцтву 610,6 рубля за кВт/г, пры дыферэнцаваным тарыфе па часавых перыядах: у час мінімальных нагрузак (з 22.00 да 17.00) — 427,4 рубля за кВт/г, у час максімальных нагрузак (з 17.00 да 22.00) — 1221,2 рубля за кВт/г.

**Сяргей КУРКАЧ.**

## АПЕРАЦЫЮ ПАЦЫЕНТЦЫ «ЭКАМЕДСЭРВІСА» РАБІЛІ, ВЫКАРЫСТОЎВАЮЧЫ НЯСПРАЎНУЮ АПАРАТУРУ

**Тром супрацоўнікам медыцынскага цэнтра, дзе рабіла пластычную аперацыю 23- гадовая жыхарка Гродна Юлія Кубарава, прад'явілі канчатковыя абвінавачванні ва ўчыненні злачынства. Пра гэта «Звяздзе» паведамілі ў аддзеле інфармацыі і сувязі з грамадскасцю Следчага камітэта Беларусі.**

У прыватнасці, у неналежным выкананні прафесійных абавязкаў, што пацягнула па неасцярожнасці смерць пацыента, абвінавачваецца ўрач анестэзіёлаг-рэаніматолаг, кіраўнік групы анестэзіялогіі і рэанімацыі СТАА «Экамедсэрвіс». Дзеянні ж генеральнага дырэктара медцэнтра і галоўнага інжынера інжынерна-эксплуатацыйнага аддзела кваліфікаваныя па арт.428 (службовая халатнасць, якая пацягнула па неасцярожнасці смерць чалавека) Крымінальнага кодэкса.

— Устаноўлена, што падчас той аперацыі выкарыстоўвалася няспраўная анестэзіялагічная апаратура для штучнай вентыляцыі, — распавяла **афіцыйны прадстаўнік Следчага камітэта Юлія ГАНЧАРОВА**. — Гэта прывяло да кіслароднага галадання галаўнога мозга і да смерці пацыенткі Юліі Кубаравай. Цяпер Следчы камітэт рыхтуе матываванае прадстаўленне аб ліквідацыі прычын і ўмоў, што садзейнічалі здзяйсненню гэтага злачынства.

Нагадаем, што Юлія Кубарава памерла пасля правядзення пластычнай аперацыі па карэкцыі формы носа. Аперацыя праводзілася ў медыцынскім цэнтры «Экамедсэрвіс» напрыканцы сакавіка. Пасля яе дзяўчына так і не прыйшла ў прытомнасць, была шпіталізавана ў 4-ю гарадскую клінічную бальніцу Мінска, дзе чатыры тыдні правяла ў коме. Выратаваць яе не ўдалося.

**Надзея ДРЫЛА.**

Марыяна ШЧОТКІНА:

# «МЫ ЗАЦІКАЎЛЕНЫ Ў ПАШЫРЭННІ СЕТКІ ПРЫВАТНЫХ ІНТЭРНАТАЎ»

**30 кастрычніка міністр працы і сацыяльнай абароны Беларусі Марыяна Шчоткіна правяла «прамую тэлефонную лінію» і анлайн-прыём на сайтах Мінпрацы і БЕЛТА. «Звязда» працягвае публікаваць адказы міністра на найбольш значныя і актуальныя пытанні.**

**— Якія, на ваш погляд, перспектывы дзяржаўнага сацыяльнага заказу ў Беларусі?**

— Перспектывы развіцця сацыяльнага заказу відавочныя. Гэта якасна новы этап развіцця аказання сацыяльных паслуг. У рамках дзяржаўнага сацыяльнага заказу будзе магчыма субсідаванне са сродкаў мясцовых бюджэтаў дзейнасці недзяржаўных некамерцыйных арганізацый па аказанні сацыяльных паслуг і рэалізацыі сацыяльных праектаў.

Для ўкаранення гэтай навацыі неабходны пэўны час — як мясцовым выканаўчым і распарадчым органам для выяўлення праблем, вырашэнне якіх патрабуецца ў першачарговым парадку, так і грамадскім аб'яднанням для ацэнкі ўласных магчымасцяў і гатоўнасці працаваць у новых умовах.

На гэтым этапе механізм дзяржаўнага сацыяльнага заказу адпрацоўваецца на практыцы ў рамках праекта, які рэалізуецца пры падтрымцы Мінпрацы і сацабароны Беларускім таварыствам Чырвонага Крыжа ў Гродне.

**— Паведамлялася, што прапрацоўваецца пытанне ўпарадкавання назначэння і выплаты дапамогі па доглядзе інвалідаў першай групы і састарэлых, якія дасягнулі 80-гадовага ўзросту. Што зменіцца?**

— Сапраўды, гэтае пытанне прапрацоўваецца. Дзяржаўная падтрымка павінна прадастаўляцца толькі таму, хто не можа самастойна справіцца з праблемамі. Таму наша задача — заканадаўча замацаваць менавіта такі падыход. Неабходна цалкам выключыць выпадкі, калі афармляецца дапамога, а догляд састарэлага чалавека належным чынам не ажыццяўляецца.

**— Ці будзе ў Беларусі ўстаноўлены адзіны тарыф на сацыяльныя паслугі і ў якім памеры? Чым гэта абумоўлена?**

— Заканадаўствам аб цэнаўтварэнні сацыяльныя паслугі, якія аказваюцца дзяржаўнымі ўстановамі сацыяльнага абслугоўвання, аднесены да сацыяльна значных паслуг, тарыфы на якія рэгулююцца аблвыканкамамі і Мінскім гарвыканкамам.

Сёння тэрытарыяльнымі цэнтрамі сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва аказваюцца сацыяльныя паслугі, якія ўваходзяць у пералік бясплатных і агульнадаступных, зыходзячы з кошту гадзіннага тарыфу ў сярэднім каля 3000 рублёў. Канкрэтны памер устанаўліваецца аблвыканкамамі і Мінскім гарвыканкамам.

Абмяркоўваецца неабходнасць устанаўлення рэкамендаванай адзінай ніжняй мяжы гадзіннага тарыфу на сацыяльныя паслугі па рэспубліцы.

**— Колькі ў Беларусі льготнікаў? Якое ваша стаўленне да магчымасці далейшай аптымізацыі льгот? А можа, патрабуецца іх пашырэнне?**

— У адпаведнасці з заканадаўствам, асноўныя сацыяльныя льготы прадастаўляюцца толькі тым катэгорыям грамадзян, якія сапраўды маюць патрэбу ў дзяржаўнай падтрымцы і не ў стане самастойна аплачваць адпаведныя выдаткі (інвалідам, грамадзянам, якія захварэлі і перанеслі прамянёвую хваробу, выкліканую наступствамі катастрофы на Чарнобыльскай АЭС і інш.), а таксама тым грамадзянам, якія маюць асаблівыя заслугі перад дзяржавай (Героям Беларусі, поўным кавалерам ордэнаў Славы, Працоўнай Славы, інвалідам вайны, ветэранам Вялікай Айчыннай вайны і інш.). Гэтыя людзі могуць знаходзіцца на ўліку ў розных органах, якія забяспечваюць іх пенсіянаванне, у тым ліку ў органах па працы, занятасці і сацыяльнай абароне.

Па стане на 1 кастрычніка 2013 года на ўліку знаходзілася каля 580 тыс. чалавек.

Для шэрагу катэгорый грамадзян законам устанаўліваюцца спецыяльныя ўмовы для атрымання льгот. Напрыклад, улічваецца, ці з'яўляецца чалавек непрацуючым, ці пражываюць з ім сумесна члены сям'і, ці ёсць медыцынскія паказанні і шэраг іншых. Гэта дазваляе зрабіць прадастаўленне льгот больш адрасным — менавіта тым асобам, якія ў іх найбольш маюць патрэбу.

Акрамя таго, у рэспубліцы існуюць падатковыя льготы, льготы ў сферы пенсійнага забеспячэння і іншыя. Так, напрыклад, ёсць ільготы па падатку ў выглядзе стандартнага падатковага выліку для бацькоў, якія маюць дзіця да васямнаццаці гадоў, для шматдзетных сем'яў існуюць ільготы па выплаце падатку на нерухомасць.

У перыяд з 1 мая па 30 верасня ўсе грамадзяне, якія дасягнулі пенсійнага ўзросту (а іх сёння каля 2,5 млн чалавек), у адпаведнасці з Указам Прэзідэнта Беларусі ад 29 красавіка 2011 г. № 176, забяспечваюцца правам на льготны праезд у прыгарадным транспарце.

У выпадку неабходнасці падтрымкі якіх-небудзь катэгорый грамадзян дзяржавай прымаюцца дадатковыя меры. У 2012 годзе было прынята рашэнне аб прадастаўленні льгот дзецям да 3 гадоў у частцы забеспячэння іх бясплатнымі лекавымі сродкамі.

У рэспубліцы склалася сістэма прадастаўлення льгот. Вядома ж, механічнага пашырэння льготных катэгорый грамадзян быць не павінна. Падтрымка павінна быць адраснай. Разам з тым, кожны з нас разумее, што, калі з-за аб'ектыўных прычын такая дапамога спатрэбіцца, з боку дзяржавы яна абавязкова будзе аказана.

**— У Беларусі з'яўляюцца першыя прыватныя дамы-інтэрнаты для састарэлых і інвалідаў. Гэта, вобразна кажучы, калегі ці канкурэнты дзяржаўных устаноў сацабслугоўвання?**

— Клопат пра годнае жыццё грамадзян у сталым узросце — адна з найважнейшых задач дзяржавы. У адпаведнасці з Законам «Аб сацыяльным абслугоўванні», сацыяльныя паслугі ў нашай краіне могуць аказваць як дзяржаўныя арганізацыі сацыяльнага абслугоўвання, так і іншыя юрыдычныя асобы, а таксама індывідуальныя прадпрымальнікі. Такім чынам, стацыянарныя ўстановы, незалежна ад формы ўласнасці, заклікаты вырашаць адну задачу — якаснае сацыяльнае абслугоўванне пажылых людзей і інвалідаў. Чалавек павінен мець права выбару, у якую ўстанову яму звярнуцца па сацабслугоўванне.

Сёння ў 79 дзяржаўных стацыянарных установах сацыяльнага абслугоўвання атрымліваюць паслугі больш за 18 тысяч чалавек.

Зараз недзяржаўны сектар стацыянарнага (кругласутачнага) сацыяльнага абслугоўвання толькі пачынае развівацца. Пачаў працу адзін прыватны дом-інтэрнат, які размяшчаецца ў Мінскай вобласці (у ім пражывае 12 чалавек). Функцыянуюць некалькі дамоў міласэрнасці розных рэлігійных канфесій, якія дзейнічаюць на тэрыторыі нашай краіны.

Адзначу, што пры стварэнні прыватнага дома-інтэрната была выкарыстана нарматыўна-прававая база для дзяржаўных устаноў і вопыт іх працы ў пытаннях прадастаўлення сацыяльнага абслугоўвання, абавязкаў медыцынскага персаналу, патрабаванняў да размяшчэння грамадзян, арганізацыі харчавання, пажарнай бяспекі для арганізацый, незалежна ад формы ўласнасці і арганізацыйна-прававой формы.

Цяпер міністэрства сумесна з Дзяржстандартам працуе над тэхнічнымі нарматыўнымі прававымі актамі па пытаннях сацыяльнага абслугоўвання (віды сацыяльных паслуг, патрабаванні да аб'ёму, умоў і парадку іх аказання), якія будуць абавязковымі для выканання ўсімі арганізацыямі сацыяльнага абслугоўвання, якія дзейнічаюць на тэрыторыі рэспублікі.

Мы зацікаўлены ў пашырэнні сеткі прыватных інтэрнатаў і адкрыты для супрацоўніцтва з бізнес-супольнасцю па гэтым кірунку.

З мэтай укаранення новых сацыяльных тэхналогій міністэрствам зацверджана палажэнне аб заснаванні новага тыпу — гэта дом-інтэрнат (аддзяленне) павышанай камфортнасці для састарэлых і інвалідаў. У такіх установах сацыяльныя паслугі будуць прадастаўляцца на платнай аснове пастаянна або часова. Тут ствараюцца палепшаныя ўмовы пражывання, забяспечваецца догляд на сучасным узроўні, у тым ліку па індывідуальнай праграме, з улікам патрэб кожнага чалавека.

**Падрыхтавала Святлана БУСЬКО.**

**Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь выказвае глыбокія спачуванні старшыні праўлення ЗАТ «Другі нацыянальны тэлеканал» Кісялю Рыгору Леанідавічу ў сувязі з напаткаўшым яго вялікім горам — смерцю ЖОНКІ.**

Дзмітрый КАРАСЬ:

■ Медыяперсона

# «ІНДЫВІДУАЛЬНАСЦЯЎ СЯРОД ВЯДУЧЫХ ЗАСТАЛОСЯ МАЛА»

**На тэлеканале «Беларусь 2» пачынаецца новы сезон праекта «Імперыя песні». Нязменным вядучым народнага караоке-шоу з'яўляецца Дзмітрый Карась. На яго рахунку — праекты «Танцуюць усе», «Інстытут культуры», «Добрай раніцы Беларусь!», праца ў эфіры навін. Сёння ён агучвае свае думкі за кадрам пра тое, што адбываецца з густамі гледачоў і як успрымаецца папулярнасць з узростам.**



***— Заўтра стартуе другі сезон шоу «Імперыя песні». З якімі адчуваннямі чакаеце эфіраў?***

— Мы пачыналі думаць пра другі сезон з таго пункту гледжання, а ці патрэбны гэты праект надалей увогуле? І вырашылі, што, працягваючы працаваць над праграмай, трэба яе неяк змяніць, прыўнесці новыя і цікавыя моманты, палепшыць якасць. Цяпер амаль кожны дзень абмяркоўваю штосьці са сваёй творчай групай, бо прысутнічае хваляванне: як будзе ўспрымацца наша новае бачанне праекта гледачом? Таму што тыя, хто прысутнічаў на здымачнай пляцоўцы, былі ў лёгкім шоку ад нашых «хадоў». Але не буду прыадкрываць заслону. Нязменным застаецца толькі тое, што мы даём нашым удзельнікам магчымасць заявіць пра сябе.

***— Ці назіраеце за далейшым лёсам удзельнікаў?***

— Не скажу, што адсочваю гэта, але ўдзельнікі самі паведамляюць мне пра змены ў сваім жыцці. Пра свае поспехі і дасягненні. Тэлефануюць, пішуць у сацыяльных сетках. У сваіх гарадах яны сталі сапраўды знакамітымі, іх часцей запрашаюць выступаць. Часам даходзіла нават да камічных выпадкаў, калі мне агучвалі сумы іх ганарараў і яны аказваліся большымі, чым заробкі прафесійных артыстаў. Але нельга лічыць, што варта толькі з'явіцца на тэлеэкране — і ты ўжо «зорка». На жаль, не ўсе любяць працаваць, а проста сядзяць і чакаюць свайго прадзюсара. А ён калі ў нас і ёсць, той прадзюсар, то да яго можа трапіць адзін з мільёна. Чалавек павінен сам імкнуцца да поспеху. Калі будзе жаданне «стварыць сябе», то з'явяцца і эфіры на радыё і тэлебачанні, і канцэрты.

> **У першых эфірах я так хутка гаварыў ад хвалявання, што мяне потым нават у прыклад прыводзілі, як, маўляў, трэба чытаць навіны. Яны ж не ведалі прычыны**

***— Сёння забаўляльныя праграмы вельмі папулярныя. Ці сведчыць гэта пра густы аўдыторыі?***

— Не скажу, што гэта «хворы мазоль», але сітуацыя дае падставы для разважанняў. Я адсочваю той прадукт, які ствараюць канкурэнты (а сваё караоке-шоу цяпер ёсць на кожным канале) і лаўлю сябе на думцы: няўжо, акрамя песень, у нас больш нічога няма? А другі момант... Мне крыўдна за нашых прафесійных артыстаў, бо яны не заўсёды маюць такую колькасць эфіраў, як «зоркі» з народу.

Вялікая колькасць гледачоў такіх праграм, на мой погляд, сведчыць пра запатрабаванасць фармату і, разам з тым, пра «падзенне» густу аўдыторыі. І такі момант не можа натхняць і радаваць. Ёсць жаданне даваць аўдыторыі нешта больш вытанчанае. Мне, напрыклад, вельмі імпануе тое, што робяць літоўцы. Я быў уражаны, калі даведаўся пра іх праект «Трыўмфальная арка», які на працягу трох сезонаў збіраў амаль усю краіну каля тэлевізараў. Удзельнікі гэтага шоу выконвалі арыі з опер, мюзіклаў, спектакляў. А пасля заканчэння праекта вялікім попытам карысталіся дыскі з відэазапісамі эфіраў. Тут мы назіраем сітуацыю, калі якасць прадукту супала з падрыхтаванасцю глядацкай аўдыторыі. У нашай публікі густы пакуль што іншыя. Падабаецца шансон. І я нічога супраць не маю, бо і мне ён падабаецца. Аднак калі адно і тое ж на кожным канале, то хочацца іншага. Пакуль што я не магу рызыкнуць і зрабіць нешта, напрыклад, для тых жа оперных выканаўцаў, бо мы арыентуемся і на нейкія рэйтынгі. Таму, магчыма, з часам, калі ў нашай праграмы пашырыцца аўдыторыя і мы будзем адчуваць да яе моцную любоў, то можна будзе па крыху ўводзіць нейкія больш сур'ёзныя і складаныя творы.

***— Праект «Імперыя песні» дазваляе яго ўдзельнікам адчуць папулярнасць. А як вы ставіцеся да ўвагі ў свой адрас?***

— Цяпер я ўжо прызвычаіўся да таго, што мяне не пазнаюць. Калі толькі пачынаў працаваць на тэлебачанні, то пасля першых эфіраў здавалася: выйду на вуліцу — і ўсе ў мяне будуць, браць аўтографы... А зараз няма часу звяртаць на гэта ўвагу. Папулярнасць — не галоўнае, і яна грэе ў юным узросце, бо здаецца, што калі цябе пазнаюць, то будзе і здароўе, і поспех, і грошы... Я нават у нечым спачуваю тым, хто знаходзіцца ўвесь час пад «позіркамі», бо складана недзе з'явіцца і спакойна адпачыць.

Акрамя гэтага, на экране ты з прычоскай, у касцюме, а ў жыцці бываеш розным. Я, напрыклад, магу не пагаліцца, магу проста кепку на галаву насунуць. Быў у мяне выпадак падчас працы на «Добрай раніцы, Беларусь!». Еду раніцай на эфір, не спяшаюся, слухаю музыку. А даішнікі па маім знешнім выглядзе і павольнай хуткасці, падумалі, быццам хлопец вяртаецца з вечарынкі. Я ж з якой прычоскай прачнуўся, з такой і за руль. Пасля гэтага выпадку я купіў сабе кепку і толькі так ездзіў на ранішні эфір.

> **Мне крыўдна за нашых прафесійных артыстаў, бо яны не заўсёды маюць такую колькасць эфіраў, як «зоркі» з народу.**

***— Які вопыт вы набылі падчас працы на «Добрай раніцы, Беларусь!», у выпусках навін?***

— Я пачынаў з выпускаў навін на «8 канале», а дагэтуль была нядоўгая праца на Гомельскім тэлебачанні. Навіны тады ішлі яшчэ ў запісе. Думаў, калі траплю ў прамы эфір, то буду сапраўдным вядучым. У першых эфірах я так хутка гаварыў ад хвалявання, што мяне потым нават у прыклад прыводзілі, як, маўляў, трэба чытаць навіны. Яны ж не ведалі прычыны (*смяецца*). А побач працавалі людзі з вопытам, у якіх за плячыма былі гады эфіраў. Мне здаецца, лепш за іх не было і няма. У некага я вучуся не толькі прафесіяналізму, але яшчэ і стаўленню да жыцця.

На «Добрай раніцы, Беларусь!» я знайшоў добрую каманду. Навучыўся многім тэхнічным момантам, бо ў нас на праекце працуе добры рэжысёр. Набыў вопыт у плане арганізаванасці, паколькі працаваць тры гадзіны ў прамым эфіры не так лёгка. Бывалі і кур'ёзы, з якіх трэба было знаходзіць выйсце.

***— А сёння ўзровень вядучых іншы?***

— Цяпер такое адчуванне, што людзі трапляюць у эфір з вуліцы. Нейкія дэфекты, недахопы лічацца «фішкамі», паказчыкамі індывідуальнасці. Але гледачы здольны і самі ўсё ацэньваць. І, зыходзячы з гэтага, выбіраць, што глядзець і слухаць. Асабіста мне можа нешта не падабацца, а нехта іншы проста не зверне на гэта ўвагі. Я для прагляду выбіраю тыя праграмы, якія мяне цікавяць і дзе я магу нечаму навучыцца ў вядучых. Індывідуальнасцяў засталося мала.

**Алена ДРАПКО**

■ Наш фармат

# ШТО ПЕЦЬ БУДЗЕМ?

## АЎТАР ЛЕПШАЙ ПЕСНІ 2013 ГОДА АТРЫМАЕ ПРЭМІЮ

**16 снежня ў Мінску пройдзе ўрачыстае ўшанаванне пераможцаў Нацыянальнай музычнай прэміі, вылучэнне на якую пачынаецца сёння.**

Нацыянальная музычная прэмія, заснаваная сумесна Міністэрствам культуры Беларусі і тэлеканалам «Сталічнае тэлебачанне», будзе ўручацца ўжо ў трэці раз. Паводле слоў **першага намесніка міністра культуры Беларусі Уладзіміра Карачэўскага,** ніякіх істотных новаўвядзенняў і рэзкіх змен у фармаце ўзнагароды не адбудзецца: удзел у конкурсным адборы па-ранейшаму могуць прыняць артысты, прадзюсары і аўтары песень — грамадзяне Беларусі, незалежна ад месца пражывання. Колькасць асноўных прызавых намінацый засталася леташняй — 19. Не змяніўся і намінальны памер грашовых прызоў: 95 базавых велічынь у дадатак да прызавой статуэткі і дыплома атрымае аўтар лепшай песні года. Пераможцы ў іншых намінацыях атрымаюць у якасці прэміі і стымулу для далейшай творчасці прэміі ў памеры ад 62 да 77 базавых велічынь, у адпаведнасці з конкурсным палажэннем. Праўда, за мінулы год базавая велічыня «падрасла» на 30%, таму прызавыя сумы ў рэшце рэшт будуць больш важкімі, чым летась.

«Нягледзячы на тое, што фармальна мы ўручаем прэмію за 2013 год, але, у адпаведнасці з палажэннем, на конкурс прымаюцца музычныя творы, якія прагучалі або былі апублікаваны, у тым ліку ў інтэрнэце, у перыяд з 1 лістапада 2012 года па 31 кастрычніка 2013 года», — адзначае намеснік гендырэктара закрытага акцыянернага таварыства «Сталічнае тэлебачанне» Павел Каранеўскі.. Збор заявак працягнецца з 1 па 21 лістапада гэтага года. Прычым дасылаць іх можна як пісьмова — на адрас Маладзёжнага тэатра эстрады (Мінск, вул. Маскоўская, 18А, з паметкай «Нацыянальная музычная прэмія»), так і ў электронным выглядзе на e-mail: nmpremia@ctv.by.

Нават за непрацяглы час свайго існавання Нацыянальная музычная прэмія выклікала ў публікі і саміх артыстаў мноства спрэчак і процілеглых ацэнак: ад захаплення да скептыцызму. Арганізатары не ўтойваюць, што ўлічваюць нават рэзка негатыўную крытыку, калі ў ёй прысутнічае рацыянальнае зерне. «Мне крыўдна чуць словы кшталту: «Што ацэньваць, калі нічога не адбываецца?» — гарачыўца Павел Каранеўскі, пералічваючы наўскідку, хто з беларускіх выканаўцаў выпусціў за гэты перыяд новыя альбомы: Аляксей Шадзько, «Крыві», «Apple Tea», The Stokes. S°unduk, Пётр Ялфімаў, «Нейра Дзюбель»... — Многія нават не ўяўляюць і не падазраюць, якая цікавая, разнастайная беларуская музыка існуе! Напрыклад, на нашых радыёстанцыях актыўна рацыруюцца каля 200 беларускіх песень гэтага года — так што журы будзе з чаго выбіраць лепшую песню года».

Імгненні «Нацыянальнай музычнай прэміі 2012».



Хоць да фінальнага шоу яшчэ далёка, але некаторыя яго «разынкі» сталі вядомыя ўжо цяпер. Па-першае, цырымонія вяртаецца ў галоўную канцэртную залу краіны — Палац Рэспублікі. Па-другое, пастаноўшчыкі абяцаюць усімі магчымымі сродкамі рэалізаваць на сцэне канцэпцыю чараўніцтва. Па-трэцяе, на гала-канцэрце чакаюцца адмысловыя госці, сярод якіх Дзмітрый Калдун, Алена Ланская са сваім эфектным нумарам «Solayoh», гурт «J:Морс» з прэм'ерай песні. Нарэшце, не абыдзецца без дадатковых узнагарод — у прыватнасці, сумесна з Беларускім рэспубліканскім саюзам моладзі СТБ узнагародзіць спецыяльным прызам лепшага дыджэя Беларусі.

### З першых вуснаў

**— Ці плануецца ў будучыні пашырыць спіс прызавых намінацый? — пацікавіліся мы ў першага намесніка міністра культуры Беларусі Уладзіміра Карачэўскага. — Бо ўсе «тэхнічныя» спецыялісты, арганізатары канцэртаў, гукарэжысёры з поля зроку неяк выпадаюць, а, між тым, ад іх таксама залежыць поспех артыста.**

— На мой погляд, трэба год-два «абкатаць» прэмію ў існуючым выглядзе, а потым прааналізаваць, ці ёсць сэнс уносіць у яе змены і дапаўненні. Асабіста маё меркаванне — неўзабаве мы да гэтага прыйдзем, у тым ліку варта звярнуць увагу яшчэ і на класічнае мастацтва, каб пашырыць межы прэміі. Але, паўтаруся, пакуль працуем па дзейсным палажэнні і сёлета змены ўносіць не будзем.

**— На якой мове будзе весціся трансляцыя і сама цырымонія? Пагадзіцеся, усё ж дзіўна, калі лепшы этна-фольк-выканаўца ці аўтар беларускамоўнай песні абвяшчаецца па-руску...**

— Гэтае пытанне мы будзем абмяркоўваць з рэжысёрска-пастановачнай групай. Спецыялісты, у тым ліку і тэлевядучыя, якія добра валодаюць беларускай мовай, у нас ёсць, таму цырымонію можна зрабіць двухмоўнай.

— Нацыянальная музычная прэмія — адбітак нашага жыцця, адбітак не толькі музычнай культуры, але і побытавай сітуацыі, — дадае Павел Каранеўскі. — І калі наша моладзь, на жаль, больш успрымае рускую мову, зразумела, якім будзе наш выбар...

— Я з гэтым не пагаджуся, — пярэчыць Уладзімір Карачэўскі, — бо ёсць цікавыя беларускамоўныя дэбюты і адкрыцці, аўтар слоў песень, уласна, намінацыя «Лепшая беларускамоўная песня». Безумоўна, ім будзе прыемна, калі іх абвесцяць па-беларуску. Дарэчы, летась адной з лепшых песень стала беларускамоўная песня Анатоля Ярмоленкі «Прыязджайце да нас у Беларусь». У рэгіёнах дагэтуль вельмі любяць і з задавальненнем выконваюць на розных пляцоўках песню Алены Ланской «Белая ластаўка»...

— Я прыгадаў, што ў мяне таксама ёсць першая ў рэпертуары беларускамоўная песня, якая гучыць у праекце «Я люблю Беларусь» на АНТ, — прызнаўся нам леташні «Лепшы поп-выканаўца» і аўтар «Лепшай песні 2012 года» Саша Нема. — То чаму б яе не вылучыць на конкурс? Наогул, мяркую, будзем удзельнічаць у некалькіх намінацыях, бо асабіста для мяне атрыманне Нацыянальнай музычнай прэміі — сапраўды вялікі стымул і вялікае прызнанне. Хоць і значная адказнасць, натуральна: ты павінен кожны дзень сваёй працай пацвярджаць, што варты падобнай узнагароды.

**— А грашовы складнік хіба не прыемны?**

— Летась прыз за лепшую песню складаў каля 9 мільёнаў рублёў, за перамогу ў намінацыі «Лепшы поп-артыст» — каля 6—7. Не буду казаць, вялікая гэта сума для мяне ці маленькая, каб не правакаваць людзей на суб'ектыўныя ацэнкі. Але тыя грошы растварыліся гэтак, як і ўсе іншыя: вось былі — і ўжо няма. Я вельмі шмат укладаю ў тэхнічнае абсталяванне сваёй невялікай студыі, дый сям'я, у якой падрастаюць дзве дочкі, таксама патрабуе клопату і выдаткаў... У любым выпадку, тыя грошы былі не лішнія і пайшлі на нейкія патрэбныя рэчы.

**Вікторыя ЦЕЛЯШУК**



Фотаздымкі Марыны БЕГУНКОВАЙ.

# ТЭЛЕТЫДЗЕНЬ

## ПАНЯДЗЕЛАК, 4 ЛІСТАПАДА

### БЕЛАРУСЬ 1

**6.00, 7.20, 8.15** Добрай раніцы, Беларусь!
**7.00, 8.00** (з сурдаперакладам), **9.00, 12.00, 15.00, 19.00, 23.40** Навіны.
**7.05, 8.05** Дзелавое жыццё.
**7.10, 8.10, 19.40, 23.20** Зона Х.
**9.10** У цэнтры ўвагі.
**10.05 Меладрама «Восеньскі марафон».**
**12.10** Дзень у вялікім горадзе.
**13.20** Клуб рэдактараў.
**14.10** Вакол планеты.
**15.15, 18.40** Навіны рэгіёна.
**15.25** Журналісцкае расследаванне.
**15.55** Заўтра — гэта мы!
**16.25** Усё як трэба!
**16.50 Камедыя «Вяселле па абмене».**
**19.20** Арэна.
**19.55** Форум.
**21.00** Панарама.
**21.45 Серыял «Каўчэг».**
**23.55** Дзень спорту.
**0.10 Трылер «Дамавік».**

### БЕЛАРУСЬ 2

**7.00** Раніца.
**9.00, 21.20** Тэлебарометр.
**9.05, 17.55 Серыял «Двое з куфэрка».**
**10.10** Навіны надвор'я.
**10.45, 0.00 Серыял «Следства вядзе Да Вінчы».**
**11.55** «Пад грыфам «Вядомыя».
**12.55 Дэтэктыў «Шынок на Пятніцкай».**
**14.45 Драма «Бывай, мая каралева!».**
**16.40** Беларуская часінка.
**19.00 Серыял «Ліквідацыя». 1-я і 2-я серыі.**
**21.25** КЕНО.
**21.30 Серыял «Інтэрны».**
**23.05 Серыял «Рэальныя хлопцы».**

### БЕЛАРУСЬ 3

**7.30** «Дабранакак».
**8.00, 13.10, 18.05, 0.15** «Калейдаскоп».
**8.05** «Росчырк часу». Віцебскі музей.
**8.20** «І ў сэрцы цэлы свет». Дак. фільм пра класіка беларускай літаратуры Змітрака Бядулю.
**8.45** «Карані».
**9.15** «Пад крылом анёла». Дак. фільм.
**9.35, 22.55 «Зорка эпохі». Серыял.**
**10.25, 22.30** «Дыя@блог». Пра мову.
**10.55 «Дзяржаўная граніца». Фільм пяты «Год 41-ы».**
**13.15, 23.50** «Святло далёкай зоркі».
**13.45** «Майстры і чаляднікі». Вышывальшчыцы.
**14.10** «Альманскія балоты».
**14.45** «Приведем ко Творцу сотворенный Им Космос». Дак. фільм.
**15.15 «Гарантую жыццё». Маст. фільм.**
**16.45** «Наперад у мінулае».
**17.15** « Без эпітафіі». Пра трагічны лёс пісьменніка і грамадскага дзеяча Змiцера Жылуновіча (Цішкі Гартнага).
**18.15 «Дзяржаўная граніца». Фільм шосты «За парогам Перамогі».**
**20.30** Калыханка.
**20.50 «Пацалунак Сакрата». Дэтэктыў. 1-я і 2-я часткі.**

### БЕЛАРУСЬ 5

**8.05** Футбол. Чэмпіянат Англіі. Прэм'ер-ліга. «Кардыф» — «Суонсі».
**9.55** Баскетбол. Ліга ВТБ. «Цмокі-Мінск» — ЦСКА.
**11.30** Футбол. Чэмпіянат Англіі. Прэм'ер-ліга. «Эвертан» — «Тотэнхем».
**13.25** Футбол. Ліга чэмпіёнаў УЕФА. Відэачасопіс.
**14.00** Дзюдо. Кубак свету. Мужчыны.
**15.30** Баскетбол. Ліга ВТБ. «Нептунас» — «Трыумф».
**17.15** Футбол. Чэмпіянат Еўропы. Прэм'ер-ліга. «Арсенал» — «Ліверпуль».
**19.00** Футбол. Чэмпіянат Англіі. Агляд тура.
**20.00** Авертайм.
**20.25** Баскетбол. Ліга ВТБ. УНІКС — «Ніжні Ноўгарад».
**22.10** Футбол. Беларусбанк — Чэмпіянат Беларусі. БАТЭ — «Шахцёр».

### АНТ

**6.00, 8.30, 9.00, 11.00, 13.00, 16.00, 18.00** (з субцітрамі), **20.30** Нашы навіны.
**6.05** «Наша раніца».
**9.05** Контуры.
**10.05** «Жыць здорава!».
**11.05, 13.05, 16.10, 18.15, 21.00** Навіны спорту.
**11.10** «У наш час».
**12.05** «Самы лепшы муж».
**13.10** «Добрага здаровейка!».
**13.55** «Модны прыгавор».
**15.00** «Сам-насам з усімі».
**16.15 Легендарнае кіно ў колеры. Маст. фільм «Афіцэры».**
**18.20** «Адваротны адлік». «Тадэвуш Рэйтан. Беларускі Дон Кіхот».
**19.00** Юрый Антонаў, група «Любэ», Леанід Агуцін, Анжаліка Варум, Тота Кутунья ў святочным канцэрце.
**21.05** Ток-шоу «Пазіцыя».
**22.05 Маст. фільм «Прыхільніца».**
**0.05** «Усё ў імя кахання».
**1.00** Начныя навіны.

### СТБ

**6.00, 7.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** «24 гадзіны».
**6.10, 17.20** «Міншчына».
**6.20, 7.45** «Раніца. Студыя добрага настрою».
**7.40, 20.10, 22.55** «СТБ-спорт».
**8.30** «Тыдзень».
**9.40** «Вялікае снеданне».
**10.20** «Гарады, якія спяваюць». Дзённік. Брэст.
**10.40, 17.30** «Званая вячэра».
**11.35** «Такі лёс».
**12.30** «Джэймі: у пошуках смаку».
**13.00** «Гарады, якія спяваюць». Дзённік. Брэсцкая вобласць.
**13.50** «Зорны рынг. Новы сезон. Бітва кавер-бэндаў». Група «DUX» супраць групы «Ё-гурт» і Ганны Шалюцінай.
**15.10** «Іншая краіна». «Японія: па той бок сушы».
**16.20** «Наша справа».
**16.50** «Па законе».
**18.30** «Вялікія тайны».
**20.00** «Сталічныя падрабязнасці».
**20.15** «Гарады, якія спяваюць». Дзённік. Жодзіна.
**20.30 Маст. фільм «Ямакасі: самураі нашых дзён».**
**23.00** «Ваенная тайна».
**0.50** «Эліксір маладосці».

### МІР

**5.00 Маст. фільм «Чароўны голас Джэльсаміна».**
**7.10** М/ф.
**9.00, 15.00, 18.00** Навіны Садружнасці (бягучы радок).
**9.10, 3.00 Маст. фільм «Волга-Волга».**
**11.10, 23.10 Серыял «Імперыя пад ударам».**
**15.10, 18.25 Серыял «Жураў».**
**20.15 Серыял «Азазель».**

### РТР—БЕЛАРУСЬ

**7.00 Камедыя «Іван Броўкін на цаліне».**
**8.35 Маст. фільм «Бацькі і дзяды».**
**10.00** «Карціна свету».
**10.55** Надвор'е на тыдзень.
**11.00** «Ранішняя@пошта».
**11.30** «Ізмайлаўскі парк».
**13.05, 14.20, 17.00, 20.30 Маст. фільм «Толькі пра каханне».**
**13.50, 16.50, 19.50, 22.00** Навіны — Беларусь.
**14.00, 20.00** Весткі.
**22.10 Маст. фільм «Легенда № 17».**

### НТБ—БЕЛАРУСЬ

**6.30** «Таямнічая Расія».
**7.20** «Чыстасардэчнае прызнанне».
**8.00, 10.00, 13.00, 16.00, 19.00** Сёння.
**8.15** «І зноў добры дзень!».
**8.40, 10.20 Серыял «Вяртанне Мухтара».**
**11.00** «Да суда».
**11.55** «Суд прысяжных».
**13.20** «Суд прысяжных. Канчатковы вердыкт».
**14.20** «Справа ўрачоў».
**15.05** «Справа густу».
**15.35, 19.20 Серыял «Шэф».**
**22.55 Серыял «З жыцця капітана Чарняева».**
**0.35** «Авіятары».

### 8 КАНАЛ

**7.00, 12.20, 19.10, 21.05, 23.50** «Надвор'е».
**7.05** «На рыбалку».
**7.20, 13.55 Серыял «Цудоўнае стагоддзе».**
**9.10, 17.35 Серыял «Рэванш».**
**10.40 «Сінематограф». Маст. фільм «Як выйсці замуж за мільянера».**
**12.25 Камедыя «Нечаканы прынц».**
**16.10** Мультпарад.
**16.20** «Мой любімы гадаванец».
**16.45 Серыял «Каварныя пакаёўкі».**
**19.15 Серыял «Фірма».**
**20.50** «Вечарніца».
**21.10 Драма «Пярэварацень».**
**23.35** «Кінаблакнот».

### ВТБ

**6.00, 1.00** «PLAY».
**8.00, 14.00, 18.00** Скетч-шоу «6 кадраў».
**8.30, 17.30** «С.У.П.».
**9.00** «Жонкі алігархаў».
**10.00** «Шлюб без ахвяр».
**11.00, 22.20 Серыял «Маргоша».**
**12.00 Серыял «Аднакласнікі».**
**13.00, 16.30** Скетч-шоу «Анекдоты».
**13.30, 17.00** Скетч-шоу «Адна за ўсіх».
**14.30, 23.30** «Улётнае відэа».
**15.00 Серыял «Крамлёўскія курсанты».**
**16.00, 18.30** Скетч-шоу «Даеш моладзь».
**19.00 Серыял «Васьмідзясятыя».**
**20.00 Серыял «Кухня-2».**
**21.10 Серыял «Маладзёжка».**
**0.00** «Дарожныя войны».
**0.30** «Ч.П?».

### НАСТАЛЬГІЯ

**5.00** Быў час». 2009 год.
**6.00** «Шэсць песень на біс». 1996 год.
**7.05** «Сустрэчы для вас. Васіль Аксёнаў». 1993 год.
**8.00** «Поле цудаў». 1991 год.
**9.00** «Жоўтая субмарына». Анімацыйны мюзікл з удзелам групы «Бітлз». 1986 год.
**10.35** «Сустрэча з Рэзо Габрыадзэ». Дак. фільм.
**11.00, 13.00** «КВЗ-64». Перадача з удзелам каманд МАДІ і МЭІС. 1964 год.
**12.00, 23.00** Колба часу».
**14.00** «Тэатральныя сустрэчы. У гасцях у Міхаіла Жарава». 1964 год.
**15.15** «З днём нараджэння». Канцэртная праграма. 1989 год.
**16.40 «Лімонны торт». Маст. фільм.**
**17.00** «Марафон-15». 1992 год.
**18.00** «Мама і хакей». Дак. фільм.
**18.25** «Залатая рыбка». Музычны тэлеспектакль. 1985 год.
**19.35** «Добрай раніцы, Дар!». 1973 год.
**20.00, 2.00** «Час» .
**21.00** «Народжаныя ў СССР».
**22.00** «Старонкі рускай паэзіі». Чытае Міхаіл Цароў. 1976 год.
**23.00** «Вакол смеху» «Які лік?». 1980 год.
**0.00** «Мы жадаем шчасця вам». Дак. фільм.
**0.35 «Гэта было ў Какандзе». Маст. фільм.**
**1.40** «Лёд і фантазія». Дак. фільм.
**4.00** «Кінапанарама». Фрагменты выпускаў 1981/88 гг.

### EUROSPORT

**10.30** Мотаспартыўны ўікэнд.
**10.45** Марафон. Нью-Ёрк.
**12.30, 17.30** Футбол. Чэмпіянат свету (U 17).
**14.30** Аўтаспорт. Чэмпіянат свету ў класе Турынг.
**15.50, 20.30, 1.30** Снукер. International Championship. Фінал.
**19.30, 0.30** Футбол. Еўрагалы.
**22.45, 3.20** Вось гэта дзіва!!!
**23.00** Пра рэстлінг.

### КАМЕДЫЯ

**5.00, 10.55, 17.00, 19.00, 2.05** Скетчком «Паміж намі».
**5.15, 8.00, 12.55, 16.00, 21.00, 2.20** Серыял «Камп'ютаршчыкі».
**6.15** Фэнтэзі «Зачараваная Эла».
**9.00** Камедыя «Любоўныя раны».
**10.40, 13.50, 15.45, 21.50, 23.50, 1.45** «Камедыянты. Лепшае».
**11.15** Дэтэктыў «К-9 — сабачая праца».
**14.10** Камедыя «Містар Піткін: Ранняя пташка».
**17.20** Камедыя «Эйс Вянтура. Вышук свойскіх жывёл».
**19.20** Камедыя «Эйс Вянтура 2: Калі кліча прырода».
**22.10** Камедыя «Фантоцы».
**0.10** Дэтэктыў «Сутэнёр».
**3.25** Камедыя «Гэтае няпэўнае пачуццё».

### ДЗІЦЯЧЫ СВЕТ

**2.00, 8.00, 14.00** Маст. фільм «Алёша Пціцын выпрацоўвае характар».
**3.10, 9.10, 15.10** М/с «Аліса ў краіне цудаў». 1-я серыя. Казкі Пушкіна. «Казка пра мёртвую царэўну і пра сем волатаў».
**4.00, 10.00, 16.00** М/с «Воін Сандакан. Кароль тыграў». Казкі Андэрсена. «Вялікі падземны баль». М/ф «Лясны канцэрт».
**5.00, 11.00, 17.00** Кінааповесць «Засакрэчаны горад». М/ф «Адважны Робін Гуд».
**6.30, 12.30, 18.30** М/с «Нябесныя танцоры».
**7.00, 13.00, 19.00** «Урокі цётачкі Савы». Зборнік м/ф «Лімпапо», «Шакаляня і вярблюд».

### ТБ3

**6.00** М/ф.
**9.15, 18.30, 3.30** «Цудоўнае стагоддзе». Серыял.
**11.00, 17.00** «Паралельны свет». Дак. серыял.
**12.00, 16.00** «Варажбітка». Дак. серыял.
**13.00, 18.00** «Паляўнічыя на прывідаў». Дак. серыял.
**13.30** «Рыа». М/ф.
**15.00, 0.50, 5.15** «Менталіст». Серыял.
**20.45** «Зонэнтау». Серыял.
**21.45** «Апостал». Серыял.
**22.50** «88 хвілін». Маст. фільм.
**1.40** «Звышнатуральнае». Серыял.
**2.30** «Сапраўдная кроў». Серыял.

### ТБ1000

**5.00** Трагікамедыя «Моцная жанчына».
**7.15** Трагікамедыя «Мачаха».
**9.25** Драма «Авансцэна».
**11.30** Драма «Перад захадам сонца».
**13.00** Фэнтэзі «Беавульф».
**15.00** Драма «Светлячкі ў садзе».
**17.00** Камедыя «З 13 у 30».
**19.00** Камедыя «Разумнікі».
**21.00** Фэнтэзі «Прыцемкі».
**23.10** Трылер «Тайнае акно».
**1.00** Драма «Залатое стагоддзе».
**3.10** Камедыя «Ужо хто б казаў 3».

### ТБ1000 РУСКАЕ КІНО

**5.10** Камедыя «Уваход праз акно».
**7.20** Дэтэктыў «Шэрлак Холмс і доктар Ватсан: Знаёмства».
**8.40** Дэтэктыў «Шэрлак Холмс і доктар Ватсан: Крывавы надпіс».
**10.00** Дэтэктыў «Шэрлак Холмс і доктар Ватсан: Кароль шантажу».
**11.20** Дэтэктыў «Шэрлак Холмс і доктар Ватсан: Смяротная схватка».
**12.40** Дэтэктыў «Шэрлак Холмс і доктар Ватсан: Паляванне на тыгра».
**14.00** Дэтэктыў «Прыгоды Шэрлака Холмса і доктара Ватсана: Скарбы Агры».
**17.00** Дэтэктыў «Прыгоды Шэрлака Холмса і доктара Ватсана: 20 стагоддзе пачынаецца».
**20.00** Баявік «Бой з ценем».
**22.25** Трылер «Адарванне».
**0.05** Камедыя «Іменіны».
**2.00** Драма «Аўсянкі».
**4.00** Камедыя «Майскі дождж».

### NATIONAL GEOGRAPHIC

**5.00, 21.00, 1.00, 4.00** Ліхтугі за мяжой.
**6.00, 16.00** Сесар Мілан: Важак зграі.
**7.00** Каралева тыграў.
**8.00, 13.00** Экстрэмальнае падарожжа.
**9.00, 14.00** Каралі рыбалкі.
**10.00** Малпачалавек.
**11.00, 23.00** Турэмныя цяжкасці.
**12.00** Зброевыя бароны.
**15.00** Апошні тыгр Суматры.
**17.00, 2.00** Апакаліпсіс: Другая сусветная вайна.
**18.00** Падарожжы кухара.
**19.00, 0.00, 3.00** Міжнародны аэрапорт Дубай.

### DISCOVERY

**7.00, 16.25** Залатая ліхаманка.
**7.50, 12.20, 3.05** Мужчына, жанчына, прырода.
**8.40, 20.35** Як гэта ўстроена?
**9.10, 20.05, 4.45** Як гэта зроблена?
**9.35, 17.20** Паляўнічыя на рэліквіі.
**10.30** Самыя дзіўныя.
**11.25, 3.55** Разбуральнікі легенд.
**13.15, 5.10** Хуткія і гучныя.
**14.10, 6.05** Вялікі махінатар.
**15.05** Пятая перадача.
**15.30** Хлопцы з гарматамі.
**18.15** Не спрабуйце паўтарыць.
**19.10** Геній распрацовак.
**21.00** Выжыць разам.
**22.00** Беар Грылс: па слядах тых, хто выжыў.
**23.00** Правілы пазадарожнага руху.
**0.00** Невытлумачальнае: спецыяльныя матэрыялы.
**0.55** Top Gear ЗША.
**1.50** Імперыя па-за законам.
**2.40** Маланкавыя катастрофы.

